Проблема целеполагания и самоорганизации: важно, чтобы у личности были не только желания, но и четко сформулированные цели. Это позволяет лучше организовать свое время и ресурсы для достижения желаемых результатов, что немаловажно для формирования волевой структуры.

Ш. А. Амонашвили отмечает, что целеполагание и самоорганизация взаимосвязаны и взаимодополняют друг друга. Четко сформулированные цели способствуют лучшему управлению временем и ресурсами, в то время как навыки самоорганизации помогают достигать поставленных целей, обеспечивая при этом устойчивость и адаптивность личности в различных ситуациях [4, с. 426].

**Заключение.** Рассмотренные подходы могут быть интегрированы в единую систему, способствующую более полному пониманию процессов, лежащих в основе формирования волевых качеств. При этом практическое применение теории будет зависеть от конкретных условий и контекста, в котором осуществляется воспитание и обучение.

**Список цитируемых источников**


1. *Абульханова-Славская, К.А.* Деятельность и психология личности / К. А. Абульханова-Славская. — М. : Наука, 1980. — 335 с.
2. *Аверьянов, А.Н.* Системное познание мира: Методологические проблемы / А. Н. Аверьянов. — М. : Политиздат, 1985. — 263 с.
3. *Алхасов, Д.С.* Преподавание уроков физической культуры / Д. С. Алхасов. — М. : МГОУ, 2013. — 178 с.
4. *Амонашвили, Ш.А.* Личностно гуманная основа педагогического процесса / Ш. А. Амонашвили. — Минск : Университетское, 1990. — 560 с.
5. *Андреев, В.И.* Педагогика: учебный курс для творческого самоопределения: 2-е изд. / В.И. Андреев. — Казань : Центр инновационных технологий, 2000. — 608 с.


УДК 376

**Ф. Д. Мыцко**
*Установа адукацыі «Трабская сярэдняя школа Іўеўскага раёна», Барановичи, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*І. І. Захарэвіч*

## ТЫПАЛОГІЯ І АСАБЛІВАСЦІ МЯНУШАК І «ВУЛІЧНЫХ ПРОЗВІШЧАЎ», ПАЧУТЫХ У АГРАГАРАДКУ ТРАБЫ ІЎЕЎСКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Уводзіны.** Хто хоць раз з нас тут прысутных не цікавіўся, адкуль з'явіліся яго імя, прозвішча, імёны яго бацькоў, бабуль і дзядуль, назва яго малой радзімы? Знайсці адказ на падобныя пытанні, як сведчаць нашы назіранні, бывае і не заўсёды так проста. Вось таму мы і вырашылі даследаваць мянушкі і «вулічныя прозвішчы», якія існавалі ў асяроддзі жыхароў нашай малой радзімы ў апошнія тры дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя. Значную дапамогу нам у працы па вырашэнню гэтага пытання аказаў настаўнік нашай шолы Захарэвіч Іван Іванавіч, які ў свой час прымаў удзел у працы рэспубліканскага форума краяведаў нашай краіны.

Мэта нашага даследавання: выявіць асабліваcці, якія існавалі паміж мянушкамі і «вулічнымі прозвішчамі» ў аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя; класіфікаваць дадзеныя ўласныя назвы, сабраныя ў аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

Задачы нашага даследавання: правесці лексіка-семантычны аналіз мянушак і «вулічных прозвішчаў» жыхароў аграгарадка Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя; класіфікаваць мянушкі і «вулічныя прозвішчы» жыхароў аграгарадка Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

Аб'ект даследавання: вусная мова жыхароў аграгарадка Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

Прадмет даследавання: мянушкі і «вулічныя прозвішчы» жыхароў аграгарадка Трабы Іўеўскага раён Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

Практычную значнасць нашай працы мы бачым у тым, што ў ёй мы паспрабавалі паказаць некаторую асаблівасць мовы жыхароў нашай маалой радзімы ў апошнія тры дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя.

**Асноўная частка.** Усім вядома, што сярод навукоўцаў не існуе адзінага падыходу да класіфікацыі мянушак і «вулічных прозвішчаў», якія сустракаліся і сустракаюцца сярод вясковых жыхароў нашай краіны. Схема семантычных груп, якую ў свой час прапанаваў У. Ліпскі, была намі ўзята за аснову даследавання таму, што яна, на нашу думку, найбольш адпавядае характарыстыцы мянушак і «вулічных» імёнаў, якія нам сустрэліся ў ходзе даследавання [1].

Тэматычныя групы мянушак, якія намі былі вылучаны ў ходзе даследавання:

1. Мянушкі, якія ўтвораны ад назваў жывёльнага свету.

«Курыца» — жанчына атрымлівала сваю мянушку таму, што ў яе сям'і было шмат дзяцей.



Репозиторий БарГУ

«Жаўручка» — жанчына, якая вельмі рана ўставала і паліла святло ў сваёй хаце. Звычайна гэтая мянушка заставалася ў жанчыны на ўсё яе жыццё.

«Сланом» называлі мужчыну, які быў пэўны час самым вялікім і дужым.

«Вераб'ём» называлі мужчыну, які пэўны час ў вёсцы быў самым невысокім. Характар, ці знешні яго выгляд мог перадацца яго сыну, ўнуку. Таму ў вёсцы так і пачыналі называць мужчын з гэтай сям'і. Звычайна гэтая мянушка сям'і перадавывлася ў вёсцы з пакалення ў пакаленне.

«Ваўчыца» — жанчына атрымлівала сваю мянушку таму, што ў яе ўзнікалі спрэчкі з аднавяскоўцамі і жыхарамі і ншых населенных пункаў.

2. Мянушкі, якія ўтвораныя ад асаблівасцей знешняга выгляду пэўнага чалавека.

«Насатай» называлі жанчыну за яе доўгі нос.

«Глухі» атрымліваў мужчына мянушку таму, што ў яго былі праблемы са слухам. Так называлі мужчыну, якому не было 60 гадоў.

«Глухая» — жанчына атрымлівала мянушку таму, што ў яе былі праблемы са слухам. Так называлі жанчыну, якой не было 45 гадоў.

«Белай» называлі маладую дзяўчыну за яе белыя валасы. Звычайна гэтая мянушка захоўвалася ў яе на ўсё жыццё.

3. Мянушкі, якія характарызуюць паводзіны і звычкі чалавека.

«Мурашка» — такую мянушку атрымлівала жанчына за тое, што яна любіла дапамагаць сваім знаёмым па гаспадарцы.

Мянушку «Лайдак» меў чалавек за тое, што яму не падабалася працаваць.

4. Мянушкі, якія ўтвораны ад імёнаў і прозвішчаў людзей.

Мянушка Міхал пайшла ад імя мужчыны Міхаіл. Характар, ці знешні выгляд яго мог захавацца ў яго сына, ўнука. Таму і гэтых людзей пачыналі так і называць Міхаламі.

Мянушка Захар (Захарыха) пайшла ад прозвішча Захар, якое насілі ўсе члены сям'і. Мужчыну гэтай сям'і называлі Захаром, а жанчыну-Захарыхай.

5. Мянушкі, якія з'явіліся ад назвы населеных пунктаў тых людзей, з якіх яны прыехалі ў аграгарадок Трабы.

«Малдаванам» у вёсцы называлі мужчыну, які меў раней некаторую сувязь з Малдавіяй. Характар ці знешні выгляд яго мог захавацца ў яго сына, ўнука. Таму ў вёсцы людзі так і пачыналі называць гэтых людзей. Звычайна гэтая мянушка заставалася ў гэтай сям'і назаўсёды.

«Літоўкай» называлі жанчыну, якая мела пэўны час некаторую сувязь з Літвой. Характар ці яе знешні выгляд маглі захавацца ў яе дачкі, ўнучкі ці праўнучкі, вось таму і гэтых жанчын аднавяскоўцы пачыналі таксама называць літоўкамі.

6. Мянушкі, ўтвораныя таму, што чалавек меў некаторыя моўныя парушэнні.

«Лыбак» — мянушка пайшла ад таго, што чалавеку не толькі падабалася лавіць рыбу, але яшчэ і не правільна вымаўляў гук «Р». Звычайна гэтая мянушка заставалася ў чалавека на ўсё жыццё. Такі недахоп у маўленні мог сустрэцца і наступных пакаленнях гэтай сям'і, таму гэтых людзей аднавяскоўцы называлі лыбакамі.

Намі была зроблена выснова, што мянушкі ў аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў апошнія тры дзесяцігоддзі ХХ стагоддзя існавалі:

1) для адрознення людзей, якія мелі аднолькавыя імёны, ці прозвішчы;

2) для выдзялення пэўнага чалавека па яго нейкай асаблівасці, якая адрознівала яго ад астатніх жыхароў вёскі;

3) больш за ўсе сярод вясковых жыхароў сустракаліся мянушкі, якія ўтвораны ад назваў жывёльнага свету, а менш за іншыя сустракаюцца мянушкі, якімі называлі чалавека, які меў моўныя парушэнні;

4) намі не былі сабраны мянушкі, якія ўтвораны ад назваў расліннага свету нашай малой радзімы, але гэта не азначае, што ў гэты час яны не існавалі сярод жыхароў нашай мясцовасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, мянушкі з'яўляюцца моўнымі адзінкамі сярод жыхароў аграгарадка Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці, якія імі перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Лінскі, У. С.* Аповесць пра нашы прозвішчы / У. С. Ліпскі — Мінск : Беларусь, — 2006.— С. 262.


Репозиторий БарГУ